В 2010-е гг. началось постепенное восстановление отношений на новой основе. В 2004 г. была создана Межправительственная Российско-Ангольская комиссия по экономическому сотрудничеству, а в 2019 г. был учрежден Деловой совет Россия – Ангола [2]. Ключевыми элементами сотрудничества стали:

– в космической отрасли – запуск спутника «Ангосат-2» в 2022 г.;
– в нефтегазовом секторе – деятельность «Роснефти» и других российских компаний;
– в области алмазодобычи – проекты компании «АЛРОСА»;
– в финансовой сфере – работа «Банка ВТБ Африка».

Сохраняется и гуманитарное сотрудничество: около 2 тыс. ангольских студентов обучаются в российских вузах, хотя масштабы значительно уступают советскому периоду [2].

Современные российско-ангольские отношения строятся на принципах прагматизма и взаимной выгоды, в отличие от идеологически мотивированной помощи в советский период. Перспективы развития связаны с углублением сотрудничества в сырьевом секторе, развитием высокотехнологичных проектов и расширением гуманитарных связей. Однако для России существуют и серьезные вызовы, включая конкуренцию с Китаем и экономические трудности обеих стран. Несмотря на это, российско-ангольские отношения продолжают демонстрировать устойчивость и потенциал для дальнейшего развития.

**Литература**

1. Страны Африки в глобальной политике XXI века : материалы XIII Всероссийской школы молодых африканистов, Санкт-Петербург, 7–8 ноября 2014 г. / Ин-т Африки РАН, СПб. гос. ун-т, Рос. совет по междунар. делам, Науч. совет по проблемам стран Африки РАН. – СПб, 2014. – 182 с.

2. Российско-ангольские отношения // Посольство России в Анголе. – URL: https://angola.mid.ru/ru/countries/bilateral–relations (дата обращения: 19.10.2024).

# Этнаграфічныя калекцыі ў музеях Беларусі: асаблівасці выкарыстання

*Міхалап П. У., асп. БДУ,*
*навук. кір. Гарбачова В. В., канд. гіст. навук, дац.*

На сучасным этапе больш за пяцьдзесят беларускіх дзяржаўных музеяў утрымліваюць этнаграфічныя калекцыі. Аднак, амаль усе яны выконваюць ролю своеасаблівага дапаможніка, нейкай абавязковай адзінкі, належнасць якой гарантуе таму ці іншаму музею стварэнне сувязі наведвальніка

з традыцыйнай беларускай культурай. Прадметы этнаграфіі ў дадзеным выпадку выкарыстоўваюцца як сродак дэманстрацыі побытавай, гаспадарчай, вытворчай або рэлігійнай дзейнасці беларусаў асобнага рэгіёну.

Найбольш распаўсюджаным з’яўляецца ўжыванне музеямі этнаграфічных збораў для дэманстравання побыту беларусаў. Так, у прыватнасці, музеямі краязнаўчага профілю этнаграфічныя прадметы шырока выкарыстоўваюцца для паказу матэрыяльнай культуры і, яшчэ больш, традыцыйнага жылля асобных геаграфічных рэгіёнаў у абраны прамежак часу. Важна падкрэсліць, што сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці розных пластоў насельніцтва найбольш яскрава выражаны ў інтэр’ерах жылля.

У склад такіх экспазіцый уваходзяць прылады працы, прадметы хатняга абсталявання, вопратка і г. д. У большасці выпадкаў дадзеныя экспазіцыі – ансамблевыя, якія ствараюць комплекснае ўяўленне пра экспанаты ў іх узаемасувязі паміж сабой [2].

Больш разгорнутым і разнастайным падаецца паказ пры дапамозе этнаграфічных прадметаў гаспадарчай сферы дзейнасці чалавека. У этнаграфічных і краязнаўчых музеях Беларусі распаўсюджанымі з’яўляюцца экспазіцыі, якія дэманструюць гаспадарчую дзейнасць беларускага сялянства пярыяду XIX – пачатку XX ст. У большасці музеяў дадзеная тэма раскрываецца ў сукупнасці з побытавай сферай і існуе пад агульнымі назвамі, накшталт: «Сялянская хата», «Сялянская сядзіба XIX стагоддзя» альбо проста «Этнаграфія» ці «Этнаграфія краю» [2]. Гэта абумоўлена тым, што раней побытавая і гаспадарчая сферы жыцця беларусаў былі непарыўна звязаны паміж сабой. У дадзеным выпадку найбольш запатрабаванымі становяцца этнаграфічныя прадметы, звязаныя з такімі гаспадарчымі заняткамі, як ткацтва і земляробства.

Таксама на Беларусі існуюць музеі, у экспазіцыі якіх назіраецца больш дакладны падзел этнаграфічных калекцый. У такіх музеях ёсць тэматычныя экспазіцыі, прысвечаныя асобным гаспадарчым заняткам і вынікам з іх. Напрыклад, экспазіцыя «Рака і чалавек» Клічаўскага краязнаўчага музея дэманструе такі гаспадарчы занятак, як рыбалоўства, а экспазіцыя Гарадоцкага раённага краязнаўчага музея пад назвай «Жаночыя рамёствы» прадстаўляе жаночыя гаспадарчыя заняткі – ткацтва і вязанне [2].

Найбольш удала адлюстраванне побытавай і гаспадарчай сфер дзейнасці адбываецца ў музеях тыпу скансэн. Яскравы прыклад такога музея – Беларускі дзяржаўны музей архітэктуры і побыту.

Калі рэгіён, вёска або горад славіцца нейкім унікальным рамяством, характэрным менавіта для гэтага рэгіёна, то тады прадметы этнаграфіі выкарыстоўваюцца як сродак дэманстрацыі вытворчай сферы. Напрыклад, можна згадаць экспазіцыю «Шапавальства» Дрыбінскага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея, экспазіцыю «Народныя майстры» Мастоўскага

дзяржаўнага музея, «Лес і чалавек» альбо раздзел «Спартры» ў экспазіцыі «Этнаграфія края ў XIX–XX ст.» Глускага раённага гісторыка-краязнаўчага музея. У склад такіх экспазіцый уваходзяць спецыялізаваныя прылады працы і прыстасаванні, якія дэманструюць тэхналагічны працэс вырабу, а таксама прадметы, якія з’яўляюцца прадуктам той ці іншай вытворчасці [1, с. 42].

Найменш распаўсюджаным у музейнай галіне з’яўляецца паказ рэлігійнага жыцця беларусаў пры дапамозе этнаграфічных прадметаў. Рэлігійная сфера раскрываецца пры дапамозе этнаграфіі перш-наперш у народных абрадах і каляндарных святах. Адлюстроўваюцца ў падобных экспазіцыях паганства, хрысціянства, юдаізм. Грунтуюцца такія экспазіцыі на традыцыйных беларускіх звычаях, звязаных з жыллём, жывёлагадоўляй, харчаваннем, раслінаводствам і г. д. Этнаграфічныя калекцыі дапамагаюць наглядна прадэманстраваць наведвальніку, як адзначалася «Масленіца», «Купалле», якія побытавыя рэчы выкарыстоўваліся ў якасці абярога і г. д.

Такім чынам, этнаграфічныя каллекцыі ў беларускіх музеях дэманструюць асноўныя традыцыйныя сферы дзейнасці беларусаў. Найбольш рэпрэзентатыўна яны прадстаўляюць побыт і гаспадарку беларускага сялянства пярыяду XIX – пачатку XX ст. Асноўны метад пабудовы экспазіцый – ансамблевы. Найменш распаўсюджаным з’яўляецца паказ рэлігійнай сферы.

**Літаратура**

1. Каткова, Л. А. Музейная справа Беларусі: сучасны стан і праблемы развіцця / Л. А. Каткова, З. М. Камароўская, І. Ю. Варанкова [і інш]. – Мінск : БелДІПК, 2004. – 87 с.

2. Музеи [сайт]. – URL: https://kultura.gov.by/organizatsii/muzei/ (date of access: 06.03.2025).

## Деятельность Молодежного совета (парламента) при Национальном собрании Республики Беларусь в вопросах повышения правовой грамотности молодежи

*Нищименко Е. С., асп. I к. БГУ, Лебединская Я. А.,*
*вып. Акад. упр. при Президенте Республики Беларусь,*
*науч. рук. проф. Антанович Н. А., д-р полит. наук, проф.*

Молодежь является самой активной прослойкой любого общества, и в Республике Беларусь на постоянной основе уделяется особое внимание молодым людям. В Республике Беларусь проживает 1 628 339 человек в возрасте от 14 до 31 года или 17,8 % от общей численности населения нашей страны [1, с. 419]. Для вовлечения молодежи в общественную жизнь создаются различные молодежные общественные объединения и структуры. Еще